**РАШЭННЕ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ**
**“Аб зацвярджэнні Рэгламента працы Выбарчай камісіі**
**па правядзенні выбараў у Каардынацыйную Раду IV склікання”**

17 лютага 2026 года г. Варшава

Кіруючыся падпунктам 4.9.4 пункта 4 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду, прынятага 20 студзеня 2026 года і міжнароднымі стандартамі правядзення дэмакратычых выбараў, у мэтах устанаўлення працэдур, якія суправаджаюць транспарэнтны электаральны працэс, Выбарчая камісія прымае наступны рэгламент.

**РЭГЛАМЕНТ ПРАЦЫ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ**
**па правядзенні выбараў у Каардынацыйную Раду IV склікання**

1. Выбарчая камісія (далей - Камісія) праводзіць адкрытыя пасяджэнні з мэтай інфармавання грамадскасці і зацікаўленых асобаў пра ход электаральнага працэсу, прынятыя рашэнні, вынікі разгляду скаргаў і іншыя пытанні, датычныя правядзення выбараў.
2. Пасяджэнні Камісіі праводзяцца вочна або праз відэаканферэнцсувязь і склікаюцца па меры неабходнасці, але не радзей за адзін раз на два тыдні. Па запрашэнні Камісіі ў яе пасяджэннях могуць прымаць удзел без права голасу прадстаўнікі грамадскасці, сродкаў масавай інфармацыі, эксперты, назіральнікі і іншыя асобы.
3. Рашэнні Камісіі, якія непасрэдна ўплываюць на электаральны працэс і яго ўдзельнікаў, паведамляюцца публічна на адкрытых пасяджэннях, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктам 4 Рэгламента.
4. У выпадках, калі разгляд пытання на адкрытым пасяджэнні стварае небяспеку грамадзянам або тычыцца інтымных бакоў жыцця асобы, Камісія можа правесці пасяджэнне ў закрытым фармаце.
5. Камісія прымае неабходныя меры, каб усе пасяджэнні па пытаннях, указаных у пункце 3 Рэгламента, праводзіліся з трансляцыяй для неабмежаванай колькасці асобаў праз YouTube-канал Каардынацыйнай рады ў жывым эфіры і з папярэднім анансаваннем пасяджэння.
6. У выпадку, калі па тэхнічных або іншых абставінах трансляцыя пасяджэння ў жывым эфіры не адбылася, Камісія прымае меры, каб відэазапіс пасяджэння быў апублікаваны ў інтэрнэт-сеціве ў найкарацейшы час. У выпадку, калі запіс пасяджэння не захаваўся, у інтэрнэт-сеціве публікуецца пратакол пасяджэння, спраўджаны подпісамі ўсіх прысутных на пасяджэнні чальцоў Камісіі.
7. Рашэнні і пратаколы пасяджэння Камісіі публікуюцца на сайце Каардынацыйнай рады не пазней за наступны дзень пасля прыняцця рашэння або правядзення пасяджэння адпаведна. У выпадку, калі да 23 гадзін 59 хвілін наступнага дня па мінскім часе пратакол або рашэнне не апублікаваны, чальцы Камісіі публікуюць пратакол або рашэнне на прыналежных ім інтэрнэт-рэсурсах цягам адной гадзіны.
8. Пратакол пасяджэння падпісваецца яго старшынёй, а прынятыя рашэнні – Старшынёй Камісіі або ўсімі яе чальцамі. Рашэнні ў выглядзе падпісанага дакумента дасылаюцца зацікаўленым бакам у тэрмін не пазней наступнага дня пасля яго прыняцця.

9. Пратакол пасяджэння можа быць абскарджаны ў Камісію ў тэрмін 3 дзён з моманту яго публікацыі любой зацікаўленай асобай або асобай, якая прымала ўдзел у пасяджэнні. Пратакол пасяджэння, на якім Камісія аб’яўляе папярэднія вынікі галасавання, можа быць абскарджаны цягам двух дзён. Пратакол пасяджэння, на якім Камісія зацвярджае канчатковыя вынікі выбараў, не абскарджваецца.

10. Камісія паведамляе на першым публічным пасяджэнні адрас электроннай пошты (office@radavoting.com), праз якую вядзецца афіцыйная камунікацыя, і прымае меры для размяшчэння гэтых звестак на сайце Каардынацыйнай рады.

11. Камісія адказвае на звароты грамадзян, якія маюць дачыненне да электаральнай кампаніі, у тэрмін не пазней 3 дзён з моманту атрымання звароту. Камісія мае права не адказваць на паведамленні, якія ўтрымліваюць пагрозы, абразы або недатычны электаральнага працэсу змест.

12. Па ініцыятыве любога з чальцоў Камісіі атрыманы на электронную пошту зварот або інфармацыя ў медыя могуць быць разгледжаны на пасяджэнні Камісіі ў тым ліку з прыняццем у гэтай сувязі рашэння.

13. Дзеянні (бяздзеянні) і рашэнні Выбарчай камісіі могуць быць абскарджаны зацікаўленай асобай у тэрмін 2 дзён з моманту атрымання ці апублікавання рашэння або з моманту, калі асобе стала ці павінна было стаць вядома пра адпаведныя дзеянні (бяздзеянне). Скарга накіроўваецца ў выглядзе падпісанага дакумента на адрас электроннай пошты Камісіі (office@radavoting.com) і павінна ўтрымліваць наступнае: а) прозвішча і імя заяўніка-грамадзяніна, а для выбарчых суб’ектаў ці іншых калектываў – назва выбарчага суб’екта ці калектыва, а таксама прозвішча і імя прадстаўніка; б) указанне на рашэнне або дзеянне (бяздзеянне) Камісіі, якое абскарджваецца; в) сутнасць скаргі з указаннем на дапушчанае Камісіяй парушэнне; г) абгрунтаванне скаргі; д) просьбітную частку.

14. У выпадку неадпавядання скаргі патрабаванням, пералічаным у пункце 13 Рэгламента, Камісія ў тэрмін 2 дзён з моманту яе атрымання паведамляе зваротным лістом заяўніку пра неабходнасць выправіць хібы ў тэрмін, які не перавышае 2 дні. Калі ва ўказаны тэрмін хібы не выпраўленыя, скарга пакідаецца без разгляду рашэннем Камісіі.

15. Камісія сваім рашэннем адмаўляе ў разглядзе скаргаў, пададзеных з парушэннем вызначанага пунктам 13 Рэгламента тэрмінам. Рашэнне аб адмове ў разглядзе скаргі можа быць адменена, а тэрмін падачы скаргі падоўжаны пры высвятленні наяўнасці ўважных абставінаў, якія перашкодзілі выканаць патрабаванні да тэрміну, прадугледжанага пунктам 13 Рэгламента.

16. Камісія разглядае скаргу, якая адпавядае патрабаванням пункта 13 Рэгламента, у тэрмін не больш за 3 дні з моманту яе атрымання. Разгляд скаргі можа праводзіцца як па-за пасяджэннямі, так і на пасяджэннях Камісіі. Па выніку разгляду скаргі Камісія прымае рашэнне аб поўным ці частковым задавальненні скаргі або аб адмове ў задавальненні скаргі.

17. Рашэнне па скарзе з яго абгрунтаваннем накіроўваецца заяўніку не пазней за 1 дзень з моманту прыняцця і агучваецца на бліжэйшым адкрытым пасяджэнні.

18. Зацікаўленая асоба, у тым ліку выбарчы суб’ект, могуць абскардзіць рашэнне Камісіі, прынятае паводле пунктаў 14-16 Рэгламента, у тэрмін не пазней 2 дзён з моманту атрымання рашэння. У такім выпадку Камісія ў тэрмін 3 дзён з моманту атрымання скаргі праводзіць адкрытае пасяджэнне, падчас якога разглядае пададзеную скаргу з запрашэннем зацікаўленых асобаў.

19. Тэрміны ў выбарчым працэсе вылічваюцца ў каляндарных днях у адпаведнасці з мінскім часам. Бег тэрміна пачынаецца з 00 гадзін 00 хвілін дня наступнага за тым, у якім адбылася падзея (ўчынак), з якой звязваецца пачатак тэрміну, і заканчваецца

ў 24 гадзіны 00 хвілін апошняга дня тэрміну. Калі апошні дзень тэрміна прыпадае на выходны дзень, то днём заканчэння тэрміну лічыцца бліжэйшы невыходны дзень. Выходнымі днямі лічацца кожная субота, нядзеля і 25 сакавіка (Дзень Волі).

20. Папярэдні тэрмін галасавання выбаршчыкаў вызначаны наступны: з 00 гадзін 00 хвілін 11 траўня 2026 года да 24 гадзін 00 хвілін 17 траўня 2026 года. Тэрмін галасавання канчаткова зацвярджаецца асобным рашэннем Камісіі.

21. У выпадку стварэння перашкодаў для дзейнасці Камісіі або іншага ўмяшальніцтва ў дзейнасць апошняй з боку любога суб’екта (ў тым ліку Каардынацыйнай рады), чальцы Камісіі неадкладна рэагуюць на сітуацыю публічнымі заявамі калектыўна або паасобку.

22. У выключных выпадках, калі ў выніку істотных і непапраўных парушэнняў, звязаных з бяспекай выбаршчыкаў, забеспячэннем таямніцы галасавання, незаконным умяшальніцтвам у дзейнасць Камісіі або матэрыяльна-тэхнічным незабеспячэннем электаральнай кампаніі, становіцца немагчымым правядзенне свабодных і справядлівых выбараў, якія адлюстроўваюць сапраўднае волевыяўленне выбаршчыкаў, Камісія можа прыняць матываванае рашэнне аб прыпыненні выбарчага працэсу або прызнанні выбараў несапраўднымі. Такое рашэнне прымаецца як крайняя мера, з улікам прынцыпа прапарцыянальнасці, і павінна ўтрымліваць абгрунтаванне немагчымасці ліквідаваць наступствы парушэнняў іншымі сродкамі.

Чальцы Выбарчай Камісіі:

Яраслаў Бекіш ________________

Алена Жылачкіна (Жываглод) Elena Zhilochkina

Пётр Маркелаў ________________

Алена Прыходзька ________________

Дзмітрый Фурманаў ________________